*Я.К. Новік, доктар гістарычных навук, прафесар*

# МЕТАДАЛОГІЯ І ПРАКТЫКА СТВАРЭННЯ ПАДРУЧНІКАЎ І ВУЧЭБНЫХ ДАПАМОЖНІКАЎ ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ ДЛЯ СЯРЭДНЯЙ ШКОЛЫ

## Аб некаторых тэарэтыка-метадалагічных і педагагічных аспектах стварэння падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў па гісторыі

Гісторыя – складаная, шматгаліновая навука аб прошлым, зведаным, аб тым, калі ўзнікла чалавечая цывілізацыя на нашай Планеце, якія этапы яна прайшла ў сваім развіцці, які агульнацывілізацыйны вопыт набыла і як яна крочыць у будучыню сёння. Пры стварэнні падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў па гісторыі пажадана кіравацца наступнымі тэарэтыка-метадалагічнымі і педагагічнымі прынцыпамі.

**Па-першае**, напісаная гісторыкамі і выпушчаная ў свет кнігавыдаўцамі, гісторыя павінна насіць пазітыўны характар, уключаць у сябе станоўчы, творчы зарад, выхоўваць у чытача высокія духоўныя і маральныя якасці і перш-наперш любоў да Айчыны, пачуццё гордасці за краіну і народ, гатоўнасць да здзяйснення добрых спраў у імя краіны і яе квітнення. Кожны грамадзянін, кожны школьнік і студэнт, які вывучыў курс гісторыі, павінен разумець, што будучае краіны і народа, будучае кожнага чалавека заключана ў прошлым, у нашай гісторыі. Напрыклад, Рэспубліка Беларусь стала суверэннай дзяржавай не толькі і не столькі дзякуючы таму, што ў канцы XIX – пачатку XX ст. нацыянальныя дзеячы Беларусі рабілі спробу стварыць нацыянальную дзяржаўнасць на буржуазнай аснове, а дзякуючы таму, што ў 1919 г. была створана Беларуская ССР, у якой у складзе СССР быў створаны магутны вытворча-эканамічны, навукова-тэхнічны і інтэлектуальны патэнцыял, які з’явіўся базай, фундаментам суверэннасці сённяшняй Беларусі. Пагэтаму гісторыя перыяду, калі БССР уваходзіла ў склад СССР, павінна разглядацца з патрыятычных пазіцый, насіць пазітыўны характар.

Бібліятэка БГУІР

**Па-другое**, гістарычная праўда ўяўляе сабой камбінаваную, шматпланавую, многагранную ісціну. Калі з гэтага складанага фарміравання (многагранніка) вылучыць толькі адну грань, паднесці яе блізка да вачэй і закрыць ёю астатнія грані, то мы атрымаем не веды, а аднабаковую, неаб’ектыўную, ненавуковую інфармацыю. Мы не ўбачым шырокай панарамы гістарычных падзей, гістарычнага працэсу ў цэлым, гістарычнай творчасці мільёнаў людзей. Некаторыя вучоныя з гістарычнага працэсу СССР і БССР 20–50-х гадоў XX ст. наўмысна, у мэтах дыскрэдытацыі сацыялізму, вырываюць толькі адну грань – палітычныя рэпрэсіі і да гэтага зводзяць усю гісторыю.

Але ж у тыя гады была здзейснена грандыёзная сацыялістычная індустрыялізацыя, створаны буйныя калектыўныя сельскагаспадарчыя прадпрыемствы. Ажыццёўленая на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў сапраўдная культурная рэвалюцыя не мае аналагаў і сёння, бо ў свеце, дзе прадстаўнікі “залатога мільярда” любяць хваліцца сваёй цывілізаванасцю, 1,2 млрд. чалавек не ўмеюць ні чытаць, ні пісаць.

А між тым ужо да канца 30-х гадоў XX ст. Савецкі Саюз адносіўся да ліку 3–4 краін свету, якім была даступна вытворчасць усіх вядомых тады чалавецтву відаў прамысловай прадукцыі. СССР разам з іншымі саюзнымі дзяржавамі перамог гітлераўскую Германію і яе сатэлітаў і пазбавіў чалавецтва ад карычневай чумы фашызму. У пасляваенныя гады Савецкі Саюз з краіны індустрыяльна-аграрнай ператварыўся ў адну з найбуйнейшых індустрыяльных дзяржаваў свету з магутным вытворча-эканамічным і навукова-тэхнічным патэнцыялам, стаў адной са звышдзяржаў свету. У 1954 г. у Савецкім Саюзе была створана першая ў свеце атамная электрастанцыя, у 1957 г. запушчаны першы ў свеце штучны спадарожнік Зямлі, у 1961 г. здзейснены першы ў свеце пілатуемы палёт грамадзяніна СССР Ю.А. Гагарына ў космас. Быў запушчаны ў космас беспілотны карабель “Буран” і здзейснена яго пасадка, арганізавана работа ў космасе навуковай станцыі “Мір”.

Библиотека БГУИР

Адказваючы на навязаную міжнародным імперыялізмам гонку ўзбраенняў, Савецкі Саюз у 1949 г. пераадолеў манаполію ЗША на ядзерную зброю, стварыўшы першую ў краіне атамную бомбу. Хутка была пераадолена таксама манаполія ЗША на тэрмаядзерную зброю, створана першая ў краіне вадародная бомба. Савецкі Саюз стварыў лепшыя ў свеце комплексы і сістэмы ўзбраенняў, у тым ліку ракетна-ядзерных і ракетна-касмічных, забяспечваючы існаванне біпалярнага свету, надзейную абараназдольнасць сваю і сваіх саюзнікаў, парытэт палітычных і ваенных сіл паміж дзвюма звышдзяржавамі (СССР і ЗША) і дзвюма ваенна-палітычнымі блокамі (Арганізацыя Варшаўскага Дагавору і НАТА).

У СССР былі забяспечаны бясплатная адукацыя і медыцынскае абслугоўванне, што трэба разглядаць як агульнацывілізацыйныя дасягненні. Кожны грамадзянін СССР меў рэальную магчымасць атрымаць бясплатнае жыллё, амаль бясплатную пуцёўку ў санаторый, пансіянат, дом адпачынку. Пастаянна раслі заработная плата і іншыя прыбыткі насельніцтва пры нязменнасці і стабільнасці рознічных цэн на тавары і паслугі, што рабіла апошнія даступнымі для шырокіх колаў народа.

У галіне культуры была здейснена сапраўдная культурная рэвалюцыя. Яшчэ ў 20–30-я гады XX ст. была ліквідавана масавая непісьменнасць дарослага насельніцтва, а ў 50–60-я гады дасягнута поўная пісьменнасць усяго насельніцтва. Беларуская ССР стала рэспублікай суцэльнай пісьменнасці. У 20–30-я гады ў БССР было ажыццёўлена ўсеагульнае абавязковае пачатковае навучанне, у 50–60-я гады – сямігадовае навучанне, а ў 70–80-я гады – усеагульнае навучанне моладзі за курс сярэдняй школы. Сапраўдны расцвет атрымала савецкая навука і культура. Беларускі народ стаў адным з інтэлектуальных народаў свету. Дзякуючы росту яго агульнаадукацыйнага і культурнага ўзроўню, дасягненні айчыннай і сусветнай культуры зрабіліся даступнымі для шырокіх мас працоўных.

Гэтыя і многія іншыя факты гісторыі, дасягненні СССР і БССР маюць не мясцовае, не нацыянальнае, а сусветна-гістарычнае, агульнацывілізацыйнае

Библиотека БГУИР

значэнне. Гаварыць аб “гістарычным краху Расіі” у выніку Кастрычніцкай рэвалюцыі, аб “гістарычным тупіку”, аб “няўдалым сацыяльным эксперыменце бальшавікоў” і г. д. – значыць займацца міфатворчасцю, выконваць палітыка-ідэалагічны заказ з тым, каб людзі, асабліва моладзь, забыліся пра Кастрычніцкую рэвалюцыю, нічога не ведалі аб савецкім дзяржаўным і грамадскім ладзе, аб дасягненнях СССР і БССР у сацыяльна-эканамічнай, палітычнай і духоўнай сферах. Такая палітызацыя і ідэалагізацыя гістарычнага працэсу з’яўляецца недапушчальнай для аўтараў падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў па гісторыі.

**Па-трэцяе**, ход гісторыі мае глыбінны сэнс, які цяжка вызначыць, але які з’яўляецца больш значным за ўсе нашы думкі і разважанні аб гісторыі. Да 1941 г., напрыклад, ніхто не мог нават уявіць сабе, што краіне і яе народу прыйдзецца весці вайну за сваё існаванне на планеце з магутнай ваеннай машынай, якая ўключыла ў сябе амаль усе рэсурсы Еўропы. Але ход гісторыі ва ўсёй яе паўнаце магчымасць вайны неяк прадбачыў: павялічваўся хуткімі тэмпамі вытворча-эканамічны, навукова-тэхнічны, абаронны і духоўны патэнцыял савецкага грамадства. Калі б гэтага не было – не было б і Вялікай Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Вызначыць гэты глыбінны сэнс хода гісторыі і праз падручнікі і вучэбныя дапаможнікі для сярэдняй і вышэйшай школы, а таксама сістэмы паслядыпломнай адукацыі зрабіць яго здабыткам усяго народа – задача ў першую чаргу прафесіянальных гісторыкаў, выкладчыкаў гісторыі, а таксама прадстаўнікоў шырокай грамадскасці.

**Па-чацвёртае**, канкрэтна-гістарычны, фактalагічны матэрыял з’яўляецца базай гістарычнай навукі, а калі яго няма, то і няма гісторыі як навукі. У сілу сваёй спецыфікі гісторыя адказвае на пытанні аб тым, што, калі, дзе, чаму і пры якіх абставінах адбылося, якія этапы прайшло ў сваім развіцці і чым стала сёння з пункту гледжання гістарычнага вопыту. Гісторыя не адказвае на пытанне аб тым, што было б, калі б тая ці іншая падзея (напрыклад, Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г., Другая сусветная вайна 1939–1945 гг. і

г.д.) не адбылася, бо гэтага ніхто не ведае і гэта не з галіны гістарычнай навукі, а з галіны гаданняў, прадказанняў і таму падобнага, да чаго навука не мае ніякага дачынення. Гісторыя – гэта тое, што было, а не тое, што магло быць.

**Па-пятае**, паколькі фактычны матэрыял з'яўляецца базай гістарычнай навукі, аўтары падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў па гісторыі не маюць права на памылку ў асвятленні гістарычных фактаў, дат і падзей, бо гэта ні што іншае, як скажэнне, фальсіфікацыя гісторыі. Тут дакладнасць павінна быць высокай. Той, хто абыякава адносіцца да гэтай адказнай справы, не мае права ўдзельнічаць у стварэнні падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў па гісторыі.

**Па-шостае**, у падручніках і вучэбных дапаможніках павінны асвятляцца ў даступнай форме асновы навуковых ведаў, якія выкладзены на старонках навуковых выданняў па гісторыі і якія прызнаны большасцю прафесіяналаў-гісторыкаў і шырокай грамадскасцю. Асабістыя погляды аўтара (ці аўтараў) падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў павінны выкладацца на старонках навуковых выданняў, але ні ў якім разе не ў кнігах для школьнікаў.

### Без права на памылкі і суб'ектывісцкія палітыка-ідэалагічныя ацэнкі гістарычных фактаў

Пачынаючы з 1994 г., Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальным інстытутам адукацыі, аўтарскімі калектывамі, кіраўніцтвам некаторых вышэйшых навучальных і навуковых устаноў выканана вялікая работа. Яе вынікам стала напісанне і выданне падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў па айчыннай і ўсеагульнай гісторыі для вучняў агульнаадукацыйнай школы. На вяршыні творчай пірамiды знаходзілася арганізаваная Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь Дзяржаўная камісія па стварэнні новых падручнікаў у сацыяльна-гуманітарнай сферы. У яе склад увайшлі самыя аўтарытэтныя вучоныя-грамадазнаўцы і выкладчыкі сярэдняй школы.

Библиотека БГУИР

Разам з тым у некаторых падручніках і вучэбных дапаможніках па гісторыі ўтрымліваюцца грубыя памылкі і суб'ектывісцкія палітыка-ідэалагічныя ацэнкі гістарычных фактаў. Зробім спробу дэталёва прааналізаваць тэкст вучэбнага дапаможніка "Гісторыя Беларусі" для вучняў 9 класа (Мінск, 1997) і вучэбнага дапаможніка "Гісторыя Беларусі" для вучняў 11 класа (Мінск, 2001). Аўтары гэтых вучэбных дапаможнікаў – У.М. Сідарцоў, В.М. Фамін, С.В. Паноў.

**Вучэбны дапаможнік для вучняў 9 класа**

1. На с.3 сцвярджаецца, што "падзеі беларускай гісторыі … высвятляюцца *з пазіцый як агульначалавечых, так і нацыянальных каштоўнасцей"*. Па-першае, вучням незразумела, што гэта за пазіцыі, у чым іх сэнс; вучняў наогул не цікавяць пазіцыі прафесараў, іх цікавіць змест дапаможніка. Па-другое, ёсць адзіная пазіцыя пры напісанні вучэбнай літаратуры – навуковая, тая, што сфарміравалася ў навуковай літаратуры.

2. На с.4 напісана: "На старонках падручніка сустракаецца *мноства розных пунктаў гледжання*". Гаворыцца пра *ўласную думку вучняў і дыскусіі па спрэчных пытаннях*. Думаю, што гэта для вышэйшай, а не сярэдняй школы, тым больш не для 9-га класа. У сярэдняй школе трэба даць асновы навуковых ведаў. А калі ў часткі вучняў з'явіцца павышаны інтарэс да гісторыі – для гэтага ёсць факультатывы і пазакласная работа. Для дыскусій і ўласных думак у дзевяцікласнікаў не хапае навуковай базы, ведання фактаў гісторыі. Не трэба блытаць розныя ступені адукацыі. Гэтым грашаць падручнікі па многіх дысцыплінах, напісаныя прафесарамі ВНУ, якія "пераблыталі" школьнікаў са студэнтамі. Адсюль знакамітая фраза: "Кандыдат навук… над задачай плача…".

3. На с.10 сцвярджаецца, што *"салдаты Заходняга фронту, будучы змучаныя вайной"*, ахвотна паддаваліся бальшавіцкай агітацыі. Думаю, што прычына не толькі ў змучанасці салдат вайной. Прымітыўная, палітызаваная ацэнка.

4. На с.13 зроблены спрэчны, ненавуковы вывад аб тым, быццам "*Кастрычніцкая рэвалюцыя на Беларусі … адбылася дзякуючы падтрымцы* партыі бальшавікоў з боку салдат Заходняга фронту". Безумоўна, армія адыграла вялікую ролю. А дзе народ Беларусі? Далей напісана, што лозунгі бальшавікоў, іх рашучасць прыцягвалі да іх не толькі салдат, але і іншыя слаі бяднейшага насельніцтва, у тым ліку сялян і рабочых. Як бачна: "прыцягвалі толькі", але не ўдзельнічалі ва ўсталяванні Савецкай улады. Разбярыся тут вучню: дзе прыцягвалі, а дзе ўдзельнічалі.

5. *Першы Усебеларускі з'езд (кангрэс) адбыўся не 7–17 снежня* 1917 г., як напісана ў дапаможніку на с.14, а 15–17 снежня 1917 г. *З'езд быў разагнаны не Аблвыканкамзахам, як напісана на с.15, а СНК Заходняй вобласці і фронту.* Больш таго, на с.20 у раздзеле "Дадатковы матэрыял" прыводзяцца вытрымкі з паведамлення Савета Народных Камісараў Заходняй вобласці і фронту ад 20 снежня 1917 г. аб роспуску Усебеларускага нацыянальнага з'езда. У вучэбным дапаможніку – грубейшыя памылкі.

6. На с.16 сказана: "У Другой Устаўной грамаце было запісана наступнае…", *на самой справе, тое, што прыводзіцца на с.16–17, было запісана не ў Другой, а ў Трэцяй Устаўной грамаце*. Ізноў грубейшая памылка, недапушчальная ў вучэбнай літаратуры.

7. На с.19 пасля цытаты з тэлеграмы кіраўніцтва БНР кайзеру Вільгельму напісана: "Пункт гледжання. На падставе гэтага дакумента частка гісторыкаў лічыць, што дзеячы БНР апынуліся *ў ролі здраднікаў* беларускага народа, *таму што бачылі магчымасць дасягнення незалежнасці Беларусі толькі ў саюзе з германскімі акупантамі*". Далей пытанне вучням: "Ці падтрымліваеце вы гэты пункт погляду?" Няўжо аўтары дапаможніка лічаць, што дзевяцікласнікі маюць дастатковую падрыхтоўку для таго, каб пагаджацца ці адвяргаць прафесіяналаў-гісторыкаў? Па-другое, справа не ў дасягненні незалежнасці Беларусі, а ў барацьбе за ўладу, спробы любымі сродкамі захапіць яе. Па-трэцяе, тыя, хто супрацоўнічае з акупантамі, рабаўнікамі краіны і яе народа – гэта заўсёды здраднікі. Думаю, што

правакацыйныя пытанні ў абарону здраднікаў не трэба задаваць. Не трэба хітраваць. Палітыка-ідэалагічная накіраванасць гэтага і мноства падобных да яго пытанняў зразумелая.

8. На с.20 *яшчэ адзін "хітры" пункт гледжання:* "…БНР была дзяржавай на "паперы", бо ні нямецкія акупацыйныя ўлады, ні савецкі ўрад не былі зацікаўлены ў яе існаванні". Яна не была дзяржавай не таму, што хтосьці не быў зацікаўлены ў яе існаванні, а таму што не мела агульнапрызнаных атрыбутаў дзяржавы. Гэта была толькі спроба стварэння ва ўмовах акупацыі беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці на буржуазнай аснове. Вось так ясна трэба напісаць у школьным дапаможніку, а не блытаць вучняў, не праводзіць адкрыта ліберальна-буржуазную ідэалогію, а даць навуковую ацэнку.

9. Чаму на с.22 напісана: "*У Рудабельскай воласці* Бабруйскага павета…", калі трэба напісаць: *"У Рудабельскай воласці…"*? Ізноў памылка. Чаму на с.22, 23 і многіх іншых ужываюцца фразы "бальшавіцкія войскі", "прабальшавіцкія войскі", "бальшавіцкая ўлада", "бальшавікі скасавалі Брэсцкі мір" і г.д., хаця вядома, што гэта былі савецкія войскі, савецкая ўлада, войскі Савецкай Расіі і г.д. Так прынята пісаць у гістарычнай літаратуры, бо ўлада была не бальшавіцкая, а савецкая.

10. Незразумела, што маюць на ўвазе, калі пішуць на с.23 пра "беларускія партыі", якія прапанавалі ідэю стварэння БССР, а апошняя – аўтаномная частка Расіі. Што гэта канкрэтна за партыі? У наступным сказе напісана, што ЦК РКП(б) прыняў пастанову аб стварэнні суверэннай БССР. Пры чым тут аўтаномія Беларусі ў складзе Расіі? Навошта блытаць дзевяцікласнікаў?

Парушана храналогія – спачатку даюцца падзеі канца 1918 г. аб утварэнні БССР, а потым – студзеня 1918 г. – аб утварэнні Белнацкома.

11. *Хто гэта прыпісаў А.Р. Чарвякову пасаду толькі старшыні Савета Народных Камісараў БССР*, калі ў 1920–1924 гг. ён быў адначасова старшынёй ЦВК БССР і СНК БССР, а ў 1924–1937 гг. – старшынёй толькі

Бібліятэка БГУІР

ЦВК БССР? Трэба, каб вучні 9-га класа яго ведалі перш-наперш як старшыню ЦВК БССР.

12. На с.26 напісана: *“Старшыня ўрада РСФСР Я. Свярдлоў абвясціў пастанову…”*. Вучні 4-га класа ведаюць, што старшынёй урада РСФСР быў “дедушка Ленин”. Я. Свярдлоў ніколі гэтай пасады не займаў. *Грубейшая памылка.*

13. На с.26 напісана: *“Ва ўрад ЛітБел беларусы не ўвайшлі”*. Няпраўда, увайшлі. Ізноў памылка канкрэтна-гістарычнага характару.

14. На с.27 *няправільна расстаўлены ацэначныя акцэнты*. Нацыянальна-дэмакратычныя партыі Беларусі пайшлі ў падполле не таму, што бальшавікі занялі да іх жорсткую пазіцыю (гэта вынік), а таму, што гэтыя партыі не прызналі савецкую ўладу і сталі на шлях барацьбы з ёю, што вымусіла бальшавікоў прыняць адэкватныя меры.

15. На с.28 дана *тэндэнцыйная ацэнка ЛітБелу*. Аб якім суверэнітэце Беларусі 1919 г. плачуцца аўтары, калі размова ішла аб жыцці і смерці Беларусі, Літвы і іншых рэспублік?

16. На с.31 ізноў праводзіцца пад выглядам пытання думка аб тым, быццам некаторыя беларускія палітычныя партыі супрацоўнічалі з акупацыйнымі ўладамі ў 1918–1920 гг. *“дзеля адраджэння незалежнасці краіны”*. На самой справе яны супрацоўнічалі з акупантамі дзеля ўсталявання сваёй буржуазнай улады над беларускім народам, дзеля стварэня беларускай буржуазнай рэспублікі. Не блытайце гісторыю! Не змяшчайце ацэначныя акцэнты!

17. Грубымі і тэндэнцыйнымі з’яўляюцца вывады на с.35. Гэткай жа грубай і тэндэнцыйнай з’яўляецца фраза М. Бярдзяева на с.36. Яе аўтары-метадысты нават прапануюць вучням для аналізу па складанай схеме. Гэта – палітызацыя, адыход ад навуковасці.

18. *На с.40 і 41 ідзе захапленне хутарской сістэмай*: “Выбар форм землекарыстання прывёў да павелічэння колькасці хутароў, якія ствараліся на былых памешчыцкіх землях. Гэта забяспечыла галоўным чынам хуткія



Библиотека БГУИР

тэмпы пасляваеннага аднаўлення вёскі, а таксама з’явілася асаблівасцю ў развіцці сельскай гаспадаркі Беларусі”. Па-першае, на былых памешчыцкіх землях ствараліся не хутары, а камуны, калгасы і саўгасы. Трэба памятаць, што гэта рабілася пры савецкай уладзе. Па-другое, стараннямі “вялікага дарэвалюцыйнага рэфарматара” П. Сталыпіна і яго паслядоўніка савецкай пары Д. Прышчэпава на Беларусі на хутары было выселена толькі каля 25% сялянскіх гаспадарак. Лічыць хутары галоўным рухавіком аднаўлення сельскай гаспадаркі і ігнараваць ролю індывідуальных сялянскіх гаспадарак, якія не выселіліся на хутары (а іх было 75%) – грубая памылка. Таксама зразумелая, палітызаваная і ідэалагізаваная: ай, як любілі хутар сяляне. Не, не любілі. Іх сілай прымушалі туды высяляцца.

19. Не трэба даваць на с.41 перагляд У.І. Леніным *“усяго пункта погляду на сацыялізм”*. Толькі блытаніна для вучняў і адсутнасць яснасці па гэтаму пытанню. Хто як хоча, так і тлумачыць гэту ленінскую фразу.

20. На с.43 ёсць пытанне: *“Які план (маецца на ўвазе план утварэння СССР) – сталінскі альбо ленінскі – вёў да стварэння ўнітарнай дзяржавы?”* Ні той, ні другі… *Аўтары не разумеюць тэрміна “унітарная дзяржава”.* Прычым, даюць падтасаванае пад свае погляды, антынавуковае вызначэнне унітарнай дзяржавы (гл. с.43). На самой справе гл.: “Советский Энциклопедический Словарь”. М., 1983, с.1377). “Унитарное государство – форма гос. устройства, при к–рой территория гос–ва, в отличие от федерации, не имеет в своём составе федеративных единиц (штатов, земель), а подразделяется на адм.-терр. единицы (р–ны, области и т.д.)”.

21. *Тэндэнцыйна*, шляхам вырывання з архіўных дакументаў некалькіх слоў і свайго каментарыя, *абаснаваны на с.52 тэзіс аб тым, што сяляне не ўспрымалі ідэю калектывізацыі*. Гледзячы якія сяляне! Тэндэнцыйна пададзены і Д. Прышчэпаў як змагар за калектывізацыю! На с.53 прыведзены ідэалагізаваныя вывады па індустрыялізацыі і калектывізацыі. Аўтары параўноўваюць, на жаль, калектывізацыю з “прыгонным правам” і нават пытаюцца ў вучняў, ці існуюць падставы для такога сцвярджэння (с.53).



Библиотека БГУИР

22. *Параграф “Усталяванне таталітарнага рэжыму. Культурныя пераўтварэнні”* – суцэльная палітызацыя і ідэалагізацыя. Ён перасыпаны выражэннямі “сталінскія індустрыялізацыя і калектывізацыя”, “рэжым аўтарытарнага цэнтралізму”, “культ асобы”, “таталітарны рэжым”, “нацдэмы” і г.д. Тут і Берман, Цанава… рэпрэсіі… Тут і 600 тыс. рэпрэсіраваных і іншыя лічбы, узятыя з кішэні некаторых аўтараў. Тут і СВБ і іншае. Не дзіўна, што вучні не ведаюць гісторыі. З гэтымі выражэннямі, лічбамі і фактамі хаця б справіцца студэнтам.

23. *Рэформа беларускай мовы 1933 г. падаецца тэндэнцыйна*, у выніку рэформы беларуская мова быццам “значна наблізілася да рускай”. Паводле рэформы 1933 г., беларуская мова – гэта мова Я. Купалы і Я. Коласа, мова насельніцтва цэнтральных рэгіёнаў Беларусі. Хто з аўтараў-гісторыкаў можа даказаць, што мова 1933 г. горшая за мову Тарашкевіча ці Лёсіка? Зразумела, каго хваляць і каго ахайваюць: “маскалёў”, якія наблізілі беларускую мову да рускай мовы. Факт пададзены правільна, а вывад – выпад у бок Масквы, прычым зроблены выпад асцярожна: толькі наблізілася да рускай… думай, – беларускай мовы няма, яе “маскалі” знішчылі рэформай, якую навязалі роднай старонцы.

24. На с.58 напісана: *“Культурная рэвалюцыя ў БССР прывяла да павышэння культурнага ўзроўню мас, аднак абярнулася абмежаваннямі ў развіцці нацыянальнай культуры і насаджэннем марксісцкай ідэалогіі”*. Першае супярэчыць другому. А дзе ідэалогія не насаджаецца? Тады насаджалі марксісцкую ідэалогію, сёння – буржуазную. Формы і метады насаджэння ідэалогіі могуць быць розныя. Але ўсім гэтым не трэба забіваць галовы дзевяцікласнікам. Як і тэрмінам “дзяржаўны сацыялізм”, як і сцвярджэннем аб тым, быццам сацыялізм “склаўся ў выніку шырока рэкламуемых сацыялістычных пераўтварэнняў”. Не, ён склаўся ў выніку дзейнасці народа. Трэба пісаць чэсна.

25. На с.65 напісана: *“Пункт гледжання. У савецкай гісторыі пераход Чырвонай Арміяй савецка-польскай мяжы 17 верасня 1939 г. лічыўся*

*вызваленчым паходам у Заходнюю Беларусь”.* А як інакш лічыць? Пытанне носіць правакацыйны характар з антысавецкім ідэалагізаваным падтэкстам.

26. На с.69 ёсць заданне: *“На аснове падзей, звязаных з далучэннем Заходняй Беларусі да БССР, дайце характарыстыку тым палітычным рэжымам, якія існавалі ў Германіі і СССР”.* Пры чым тут Германія? Пры чым тут палітычныя рэжымы? Яўна правакацыйнае пытанне… Як і лічбы на с.69 аб развіцці Беларусі.

27. На с.68 напісана аб станоўчым значэнні ўключэння Заходняй Беларусі ў склад БССР. А на с.70 прапануецца запоўніць табліцу “Уз’яднанне беларускага народа ў складзе БССР”, у якой дзве калонкі: *“Станоўчае значэнне”, “Адмоўнае значэнне”.* Што аўтары бачаць адмоўнага ва ўз’яднанні беларускага народа?

28. На с.70 дано вучням заданне высвятліць свае уласныя адносіны да партыі бальшавікоў у беларускім нацыянальным пытанні, факты перадачы Вільні Літве і г.д. Гэта не для вучняў! Гэта, мабыць, для студэнтаў і аспірантаў, а можа і для кандыдатаў навук. Не трэба ўсе факты гісторыі “цягнуць” у дапаможнік для 9 класа!

29. *Чаму ў паражэннях Чырвонай Арміі ў пачатку Вялікай Айчыннай вайны на с.71, 76 і іншых абвінавачваецца толькі Сталін?* А Наркамат абароны і Генеральны штаб Узброеных Сіл СССР? А камандаванне ЗахАВА? А камандуючыя арміямі, камандзіры дывізій і палкоў? Чаму на с.77 Д. Паўлаў называецца відным савецкім ваенным кіраўніком і даецца яго партрэт? Чаму на с.76 напісана: “…абвінавачванне было *несправядліва* ўскладзена на кіраўніцтва ЗахАВА?” Справядліва, бо па віне Паўлава, з-за яго воінскай бяздарнасці каля 700 тыс. салдат і афіцэраў ЗахАВА сталі лёгкай здабычай фашыстаў і была адкрыта дарога на Маскву. Які ж ён “відны савецкі”? “Відны” таму, што быў расстраляны. А гэта ўжо праблема ваеннага часу і да ацэнкі “відны” не мае ніякага дачынення.

Библиотека БГУИР

30. *Хіба тая сімволіка, якую дазволілі немцы распаўсюджваць* на Беларусі, ёсць нацыянальная сімволіка? (с.80) Хто гэта даказаў? Чаму ад гэтай "нацыянальнай сімволікі" адмовіўся беларускі народ у 1995 г.?

31. На с.80 напісаны вывад: "1. Жорсткія баі 1941 г. на тэрыторыі Беларусі сталі яркім доказам самаадданасці і мужнасці савецкіх людзей, якія, *нягледзячы на жахі сталінскага рэжыму*, паўсталі на абарону сваёй Радзімы. Гэта – езуіцкі прыём у ідэалагічнай рабоце: здаецца, што ацэнка дана правільная… "паўсталі на абарону сваёй Радзімы". Але фраза "нягледзячы на жахі сталінскага рэжыму" зводзіць ацэнку на нішто, бо ўзнікае пытанне: "А навошта было абараняць Радзіму, дзе былі жахі … сталінскі рэжым і г.д.?" Не трэба палохаць моладзь "жахамі": у гады вайны ніхто пра іх і не думаў, тады думалі аб абароне Радзімы і разгроме фашыстаў. А "жахі" у гады вайны прыдумалі сённяшнія ідэолагі рэстаўрацыі капіталізма за амерыканскія долары.

32. *Чаму на с.81 тэрмін "усенародная барацьба" супраць фашысцкіх захопнікаў заменены тэрмінам "масавая барацьба"?* Няўжо здраднікаў, якія на вуліцах беларускіх гарадоў і сёл у гады вайны хадзілі з бела-чырвона-белымі сцягамі, было так шмат, што гэта паставіла пад сумненне тэрмін "усенародная барацьба"?

33. На с.81 *замест Вілейскай вобласці БССР (цэнтр Вілейка) напісана Віленская вобласць* (апошняя ніколі не ўваходзіла ў склад БССР). Грубейшая памылка.

34. Прапагандысцкія прыёмы на с.82–83: "В.З. Корш – партыйны кіраўнік" (а хто канкрэтна?), замест тэрміна "Кастрычніцкая рэвалюцыя" – "кастрычніцкія падзеі", "але здраднікаў сярод партызан не знаходзілася" каб выдаць Міная, а ў іншых выпадках, разумей, – знаходзіліся. І пры чым тут партызаны, калі кожны мог выдаць немцам Міная, але *сярод насельніцтва* здраднікаў не знаходзілася.

35. На с.86 напісана: "*…бітва на Курскай дузе (ліпень 1943 г.), якая завяршыла* карэнны пералом у вайне". Тут грубейшая гістарычная *памылка*,

бо карэнны пералом у вайне завяршыўся не ў ліпені 1943 г. бітвай на Курскай дузе, а ў другой палове 1943 г., і ён звязаны з разгромам фашыстаў на Курскай дузе, летне-асеннім наступленнем Чырвонай Арміі ў 1943 г., вызваленнем Левабярэжнай Украіны і сталіцы Савецкай Украіны г. Кіева. Новы завяршальны этап вайны пачынаецца з 1944 г.

36. На с.89 напісана: *“Прыкладам для піянераў усёй краіны доўгія часы з’яўлялася дзейнасць Марата Казея…”*. Чаму “доўгія часы” і чаму “з’яўлялася”, а не з’яўляецца? Канешне, калі пісаць гісторыю з пэўных ідэалагічных пазіцый, то “з’яўлялася”, а калі з навуковых, то “з’яўляецца” і сёння прыкладам для хлопчыкаў і дзяўчынак, бо Марат Казей загінуў, абараняючы ад ворагаў Радзіму.

37. Паслухайце, якія суб’ектывізм і знявагу беларусам нясуць прафесары: “На працягу вякоў беларусы цвёрда засвоілі, што жыццё – гэта перш за ўсё праца, і *чым горшыя ўмовы жыцця, тым больш неабходна працаваць*. Мяняліся эканамічныя і палітычныя сістэмы, улады, а для абсалютнай большасці людзей *праца заставалася адзіным сродкам існавання і сэнсам жыцця*.” Якую маеце на ўвазе працу? Калі на сябе і краіну – тады праца на першым плане сярод іншага. А калі праца на жулікаў і злодзеяў? Чаму, калі горшыя ўмовы жыцця, тады больш патрэбна працаваць? На каго? Маеце на ўвазе сённяшні дзень? На буржуяў-крывапійцаў? А што, у беларусаў, акрамя працы, нічога больш няма? А хаця б адпачынак, сям’я, павышэнне свайго культурнага ўзроўню…

38. На с.101 ёсць *такі прымітыў*: аказваецца, *аднаўленне калгасаў пасля вайны – гэта “сабраць усё назад, што разнеслі і захавалі калгаснікі ў сваіх хатах з пачатку вайны”*. Нічога не разнеслі, бо ў большасці нічога не было для таго, каб разносіць. І збіраць было нічога пасля трохгадовай акупацыі. Далей ахайваецца дзейнасць па аднаўленню сельскай гаспадаркі: дзяржава заўсёды схільная была больш забіраць, чым даваць сялянам узамен”, “прымусовая калектывізацыя”, “насілле і рэпрэсіі” і г.д. І нарэшце стон і слёзы па індывідуальнаму сектару: не ўводзьце ў зман вучняў –

Библиотека БГУИР

індывідуальны сектар, прысядзібныя ўчасткі існавалі і паказвалі нярэдка нядрэнныя вынікі, бо побач з імі знаходзіліся калгасы і саўгасы, якія забяспечвалі гэты сектар тэхнікай, насеннем, жывёлай, угнаеннямі, хімікатамі і г.д. Не глуміцеся над калгасамі і саўгасамі! Яны нядрэнна кармілі і кормяць вас сёння, паважаныя прафесары, ідэолагі разбурэння калгасаў і саўгасаў.

39. *Навошта хамства ў дапаможніку* на с.102: *мужыкі і бабы"* замест каня запрагаліся ў плуг ці барану самі". Па-першае, не "мужыкі і бабы", а "мужчыны і жанчыны", а, па-другое, чаму, шаноўныя аўтары, не тлумачыце вучням, хто прымусіў мужчын і жанчын пасля страшэннай вайны запрагацца ў плуг, хто давёў іх да такога "вясёлага жыцця"? Безумоўна, не савецкая ўлада.

40. § 17 *Грамадска-палітычнае і культурнае жыццё ў пасляваенны час (1945–1959) – суцэльная ідэалагізацыя і палітызацыя, ахайванне савецкай гісторыі*. Прычым для гэтага часу забарона шматпартыйнасці? Навошта прыдумваць тэрміны, якія не прызнаны ў нашай літаратуры? Напрыклад, "працэс пераўтварэнняў у заходніх абласцях Беларусі атрымаў назву "саветызацыі" (с.106); "першыя спробы *дэсталінізацыі* савецкага грамадства" (с.112), калі ёсць тэрмін "дэмакратызацыя савецкага грамадства"; "таталітарны светапогляд стаў пануючым у грамадскай свядомасці" (с.107). А далей езуіцкі прапагандысцкі манеўр – вывад: "4. Разам з тым *народ у большасці не адчуваў сябе прыгнечаным, ганарыўся прыналежнасцю да справы будаўніцтва новага грамадства. І гэта натуральна*, таму што народу заўсёды ўласціва надзея на лепшую будучыню" (с.107). Глядзіце, які дурны народ: нічога не ведаў, не разумеў, меў таталітарны светапогляд… і гэта натуральна… Народ не толькі "ганарыўся прыналежнасцю да справы будаўніцтва новага грамадства", але і непасрэдна ўдзельнічаў у гэтым будаўніцтве.

41. На с.111 напісана: аказваецца, *удзел працоўных Беларусі ў руху за мір у 50-я гады "насіў абмежаваны характар, таму што яго арганізатарам*

*выступаў партыйна-дзяржаўны апарат, а народ яму патрэбен быў для паказной масавасці”*. Нічога, акрамя лютай нянавісці да ўсяго савецкага і выканання палітычнага заказу, такія фразы (а з іх фактычна складзена кніга) не нясуць.

42. Што азначаюць фразы: “пачалі будаваць безаблічныя пяціэтажкі з сілікатных блокаў” (“хрушчоўкі”), “але патрэбнасць у жыллі не была задаволена” (а сёння на “хвалёным Захадзе” – задаволена?) (с.118), *“адбывалася паслабленне прыгонніцкіх парадкаў на вёсцы”* (с.119) і інш. Ажно сорамна чытаць гэтыя інсінуацыі прафесараў!

43. На с.119 *утрымліваюцца авантурна-правакацыйныя заданні для вучняў*: “Што зрабіў з сялянамі Сталін?”, “авантурная палітыка ў галіне сельскай гаспадаркі Хрушчова” (аказваецца авантурная таму, што коні як працоўная сіла аджылі век, а на змену ім прыйшоў трактар, зааралі пашу, коней пусцілі пад нож, а каровы ва ўмовах бястраўя давалі недухмянае, нетлустае малако). І гэты прымітыў выдаецца за прычыны дасягнутага ўзроўню сельскай гаспадаркай ніжэйшага за намечаны.

44. На с.121 напісана: “*Улада прывучала савецкага чалавека да абмежаванняў сваіх патрэбнасцей. Таму абсалютная большасць насельніцтва* абыходзілася без кватэрнага тэлефона, не мела радыёпрыёмнікаў і тэлевізараў і на ўсе гэтыя нягоды адказвала: “Толькі б не было вайны”. Не прывучыла ўлада да абмежавання патрэбнасцей, але задавальненне патрэбнасцей залежыць ад магчымасцей дзяржавы. А далей ізноў які дурны народ: нічога не меў, жыў дрэнна і толькі гаварыў аб тым, каб не было вайны. Каментарыі тут непатрэбныя.

45. На с.122 авантурна-правакацыйнае пытанне: “*Як звалася палітыка, якая перашкаджала развіццю беларускай нацыянальнай* культуры? Такой палітыкі не існавала. Гаворачы пра развіццё культуры, апраўяргаецца гэтае пытанне.

46. На с.123 напісана: “Праўда вайны, яе гісторыя вызначаліся не пісьменнікамі, нават не гісторыкамі, а Камуністычнай партыяй, якая

Библиотека БГУИР

манапольна валодала правам на ісціну”. Гэта – палітычны заказ аўтарам дапаможніка з мэтай дыскрэдытацыі савецкага ладу.

47. *На с.123 прафесары выдаюць сябе з галавой. Яны пішуць: “беларускія пісьменнікі пакорліва трымаліся партыйных установак, як што трэба пісаць. У гэтым прычына, чаму вобразы ворагаў і здраднікаў былі амаль заўсёды карыкатурнымі, а савецкі чалавек выглядаў рыцарам без страху і заганы”.* Прафесары хацелі б, каб здраднікаў і ворагаў ухвалялі, а савецкі народ, які здабыў перамогу, выглядаў карыкатурна. Вось і ўвесь “ненавуковы”, а палітыка-ідэалагічны твар прафесараў.

48. На с.127 *ізноў думка аб дурных беларусах*, якія абыякава адносіліся да роднай мовы і нацыянальна-культурнага жыцця. Хлусіце, паны прафесары! Тут трэба тлумачыць навукова, а не на ўзроўні БНФаўскага мітынгу.

49. На с.128 ізноў палітыка-ідэалагічны вывад: “Беларуская культура ў гады лібералізацыі, хаця і *не пераадолела цалкам абмежаванняў, звязаных з прынцыпамі партыйнасці і сацыялістычнага рэалізму*, але зрабіла рашучы крок на шляху вызвалення ад сталінскай спадчыны”. Галоўнае не гэта (змешчаны акцэнты), а тое, што культура ў гэтыя гады бурна развівалася. І ніхто пра вашы “абмежаванні” тады не думаў.

50. *Тэма 10. Паварот да кансерватызму.* Наспяванне крызісу (1965–1985) – цалкам *ідэалагізаваная і палітызаваная*. У 1964–1982 гг. не было ніякага вяртання да сталінізму,навошта выдумваць гэта на с.129–130? Навошта ў падручнік цягнеце палітычныя анекдоты і самвыдат? Гаворыцца на с.131 аб тым, быццам афганскі рэжым быў адзіным палітычным рэжымам, які сімпатызаваў КПСС.

51. На с.134 напісана няпраўда пра развіццё сельскай гаспадаркі, груба, ненавукова ацэньваецца АПК, не трэба выдумваць: “Беларусь назвалі адкормачным цэхам Савецкага Саюза…” разумей як хочаш…

52. Здзіўляюць разважанні аўтараў на с.136 *аб здзеках КДБ СССР над Быкавым і Карпюком*, аб тайным наглядзе за імі, аб праглядзе перапіскі,



Библиотека БГУИР

праслухоўванні тэлефонаў. Ведайце, прафесары, што вы пішаце няпраўду, бо Быкаў быў абласканы партдзяржнаменклатурай і атрымаў усе вышэйшыя ўзнагароды Радзімы – Героя Сацыялістычнай Працы, Народнага пісьменніка і г.д. А антысаветчыкаў, як вы пішаце, везлі не ў Крэмль для ўзнагарод, а на Калыму… Па-другое, адкуль вы ўзялі матэрыялы КДБ СССР? Па-трэцяе, усё гэта не для школьнага падручніка і тады, калі б у вас былі нават архіўныя матэрыялы.

53. Навошта цягнеце "савецкі народ" у школьны дапаможнік? (с.137). Навошта пішаце няпраўду: "Нават вызначэнне колькасці гадзін на вывучэнне беларускай мовы, гісторыі Беларусі ажыццяўлялася ў Маскве (с.138).

54. Пры чым тут Марк Шагал да Беларусі 70–80-х гадоў? (с.142). Навошта цягнеце КДБ у пытанні на с.143?

55. На с.143 пастаўлена пытанне: *Якія меры прымаліся па пераадоленню спаду ў эканамічным развіцці?* А на наступнай старонцы ёсць падзагаловак: "Наспяванне крызісных з'яў у эканоміцы". Тэзіс аб крызісных з'явах у савецкай эканоміцы", "аб спадах" – не што іншае, як міфы, якія разбуральнікі савецкай грамадскай сістэмы цягнуць усюды, у тым ліку і ў школьныя падручнікі. Якія там "крызісы і спады", калі савецкая эканоміка па асобных паказчыках расла штогод на 3–7 і больш працэнтаў! Якія могуць быць крызісы пры даволі высокіх тэмпах росту? Іншая справа: тэмпы росту запавольваліся, але гэта заканамернасць для ўсіх развітых дзяржаў свету, да якіх адносіўся і Савецкі Саюз. Цяжкасці ў эканамічным развіцці існавалі. Яны мелі як аб'ектыўную, так і суб'ектыўную прыроду (дзейнасць гарбачовых, якаўлевых, сілаевых і ім падобных і іх замежных гаспадароў).

Многія цяжкасці (у тым ліку і талонная сістэма) штучна ствараліся камуністамі-рэнегатамі і "пятай калонай", каб доказаць нежыццёвасць сацыялізму. Гэта робяць і аўтары вучэбнага дапаможніка, галоўнае, без навуковых доказаў, з палітыка-ідэалагічных пазіцый сцвярджаючы на с.144 аб тым, што "*аднаўкладная дзяржаўная эканоміка, строга цэнтралізаванае кіраўніцтва, неабмежаваная ўлада партдзяржнаменклатуры над усім*



Библиотека БГУИР

*багаццем краіны* (даруйце: такой наменклатуры не было, яе выдумалі БНФаўцы ад навукі і такой неабмежаванай улады не існавала) … як факты эканамічнага росту *вычарпалі сябе…*

56. На с.145 сцвярджаецца: *“Ва ўмовах жа каманднай эканомікі нейкія вынікі дасягаліся, але ў асноўным за кошт адміністрацыйных метадаў”*. Па-першае, не нейкія вынікі, а былі вялікія дасягненні ў Савецкага Саюза і ўсіх саюзных рэспублік – і гэта дакладна вядома прафесарам; па-другое, няма краін у свеце, дзе не ўжываліся б адміністрацыйныя метады кіравання эканомікай, можна гаварыць аб тым, дзе яны мяккія, а дзе больш жорсткія; па-трэцяе, навошта хаваць сапраўдныя палітыка-ідэалагічныя амбіцыі, ужываючы на с.144 фразу: “Шукалі нейкі трэці шлях паміж каманднай сістэмай і рыначнай эканомікай”, калі “камандная сістэма” звязваецца прафесарамі з сацыялістычнай планавай эканомікай”, а “рыначная эканоміка” – з буржуазнай рыначнай эканомікай. Навошта пісаць незразумелае для вучняў? Навошта вытраўліваць з іх свядомасці ўсё тое, што звязана з сацыялізмам? Гісторыя адбылася – і яе трэба напісаць такой, якой яна з’яўлялася ў сапраўднасці.

57. На с.145 ёсць *пытанне правакацыйнага характару: “Як вы лічыце, ад чаго больш залежыць якасць прадукцыі: ад выкарыстання дасягненняў навукі ў вытворчасці альбо ад узмацнення кантролю з боку дзяржавы?* І ад таго, і ад другога, і ад трэцяга і г.д. А дзе няма прыёмкі якасці тавараў ці з боку дзяржавы, ці з боку прадпрыемства? Што прафесары бачаць дрэннага ў дзяржпрыёмцы і чаму яны штурхаюць вучня, каб ён сказаў, што гэта дрэнна?

58. На с.145 наўмысна ў фразе: *“Спад тэмпаў вытворчасці працягваўся”* *прапушчана слова “росту”*, г.зн. *“тэмпаў росту вытворчасці”*. Гэта – езуіцкі прыём, накіраваны на зман вучня, на тое, каб ён паверыў, што быў сапраўды крызіс, усё было дрэнна, усё валілася, у сацыялізма не было нічога іншага, як ісці на паклон рынку, капіталізму.

59. На с.146 памылкова сцвярджаецца, што *“зямля на Беларусі знаходзіцца па-ранейшаму ва ўласнасці дзяржавы”* і ўтрымліваецца *стогн*

Библиотека БГУИР

*з-за адсутнасці прыватнай уласнасці на зямлю як панацэі ад усіх бед*. Кніга падпісана ў друк 3 лютага 1997 г., пасля рэспубліканскага рэферэндума 24 лістапада 1996 г., які вырашыў пытанне аб куплі-продажу асноўнага масіву зямель сельскагаспадарчага прызначэння. Але і да рэферэндума і пасля яго прыватная ўласнасць на зямлю на Беларусі існуе: прыватызаваныя прысядзібныя, дачныя і садова-агародныя ўчасткі, землі пад буйныя інвестыцыйныя праекты і г.д. Трэба пісаць праўду па гэтаму пытанню. Гандляваць зямлёй і нажывацца на яе куплі-продажы ўсялякім злодзеям і жулікам беларускі народ не дазволіў. А з чым застанемся мы, калі сваю зямлю-карміліцу прададзім айчынным і замежным драпежнікам?

60. *Хто абаснаваў і навукова даказаў, што "абвальны спад вытворчасці і інфляцыя… непазбежны пры пераходзе да рынку"* (с.148)? Ліберальна-буржуазныя ідэолагі праз вучэбны дапаможнік укладваюць у галовы вучняў думкі аб тым, што разбураць эканоміку, не плаціць зарплату, кідаць людзей у галечу – усё гэта непазбежна на гэтым свеце, у рай пападзеце на тым свеце: мучайцеся і цярпіце. Вось ідэалогія гэтага вучэбнага дапаможніка. Няма ні аднаго радка аб тым, што рыначныя рэформы 1991–1994 гг. і 1994–1998 гг. – гэта зусім розныя рэформы і справа не ў пераходзе да рынку, а ў тым, хто праводзіць і дзеля чаго праводзіць гэтыя рэформы.

61. На с.148–149, на думку аўтараў, *"паслядоўныя прыхільнікі рынку… парламенцкая апазіцыя"* (г.зн. *БНФаўцы і іншыя ліберальна-буржуазныя дзеячы), а галоўным рыначнікам падаецца М. Чыгір* (прыводзіцца доўгая цытата з яго даклада 8 лютага 1996 г.), хаця ўжо напярэдадні рэферэндума 24 лістапада 1996 г. М. Чыгір паказаў, які рынак яму патрэбны і за якую "прыхватызацыю" ён змагаецца. Ніякіх змен у тэкст дапаможніка аўтары не ўнеслі, іх пазіцыя і метадалогія зразумелыя.

62. На с.149 утрымліваецца пытанне: "Ці працягвала існаваць таталітарная палітычная сістэма ў *гады праўлення М.С. Хрушчова і Л.І. Брэжнева?* М.С. Хрушчоў і Л.І. Брэжнеў не з'яўляліся царамі, а таму і *не правілі*. Яны выбіраліся на пасады і працавалі Першым і Генеральным

Библиотека БГУИР

сакратарамі ЦК КПСС. Не трэба свядома блытаць вучняў у тым, што цары і генеральныя сакратары ЦК КПСС – гэта адно і тое ж. Гэта зусім не так. Не мае права на існаванне ў падручніку фраза “За гады сталінска-брэжнеўскага кіраўніцтва”, па-першае, таму, што будзе ў гісторыі надта шмат “кіраўніцтваў”, а па-другое, Сталін і Брэжнеў кіравалі па-рознаму і ў розны час і іх “кіраўніцтвы” аб’ядноўваць будзе ненавуковым падыходам.

63. Зусім не зразумелы, заблытаны *пункт гледжання на с.150*: “…Усе дэмакратычныя перабудовы палітычнага жыцця, якія адбываліся ў рэспубліцы, не мелі ніякага дачынення да дзейнасці партыі як кіруючай сілы, дзякуючы чаму Беларусь у той час набыла аблічча адной з самых *кансерватыўных* рэспублік…”. БНФаўшчына і толькі… Знявага да Беларусі…

64. Беспадстаўным, навукова не даказаным з’яўляецца сцвярджэнне на с.152–153 аб пачатку ў 1991 г. моцнага рабочага руху на Беларусі і барацьбе рабочых супраць КПБ. Гэта рабіла “пакрыўджаная” інтэлігенцыя, рэнегаты-камуністы, якім метадам сацыяльнай дэмагогіі ўдалося павесці за сабой нязначную частку рабочых. Акцэнты ў дапаможніку расстаўлены няправільна. Вучні ўводзяцца ў зман, бо рабочыя, калгаснікі, нізавая інтэлігенцыя да дзяржаўнага перавароту 1991 г. не маюць ніякага дачынення.

65. На с.154 зроблена заданне: Раскажыце аб павышэнні ролі Вярхоўнага Савета Беларусі ў грамадска-палітычным жыцці і кіраўніцтве дзяржавай. Заданне носіць правакацыйны характар, бо Вярхоўны Савет так “павысіў сваю ролю”, што ад яго народу прыйшлося адмовіцца на рэферэндуме.

66. На с.154 напісана пра *“рух народаў за набыццё рэспублікамі сапраўднага дзяржаўнага суверэнітэту”*. Рух быў, але не народаў, а “пятай калоны” рэспублік і іх заходніх доларавых гаспадароў. Па-другое, што такое “сапраўдны дзяржаўны суверэнітэт” і калі ён быў і ці ёсць сёння – на гэтыя пытанні адказу для вучняў няма.



Библиотека БГУИР

67. На с.155 і 165 напісана аб тым, што *СССР быў унітарнай дзяржавай. Гэта – грубейшая памылка.* Вучням 4 класа павінна быць вядома, што СССР быў федэрацыяй. Спрэчнымі з'яўляюцца развважанні пра путч 1991 г.

68. Навошта на с.163 гаворыцца пра М. Чыгіра? Што ён зрабіў добрага для дзяржавы? Навошта такімі прозвішчамі забіваць галовы дзевяцікласнікаў?

69. Навошта на с.164 і 165 вытрымкі з Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР (27 ліпеня 1990 г.)? Кніга выдавалася пасля рэферэндума 1996 г., калі беларускі народ, не пажадаўшы святкаваць 27 ліпеня як Дзень Рэспублікі, негатыўна ацаніў тое, што рабілася палітыкамі 27 ліпеня 1990 г. Сімпатыі аўтараў да гэтай Дэкларацыі і гэтага дня зразумелыя. Дэкларацыя сапраўды была прынята 27 ліпеня 1990 г., але яе ацэнкі тады і сёння – розныя.

70. Правакацыйны характар носіць заданне: самастойна высвятліць *прычыны, па якіх дапамога ААН Беларусі ў пераадоленні вынікаў аварыі на ЧАЭС прыйшла са значным спазненнем.* А можа лепш было б высвятліць памеры дапамогі з боку ААН і параўнаць яе з тым, што зроблена і робіцца самой Рэспублікай Беларусь! Не трэба біць "памёршага быка" – Палітбюро ЦК КПСС і тагачаснага кіраўніка Беларусі! Не трэба лішні раз зневажаць сацыялістычны дзяржаўны і грамадскі лад, лепш паглядзець без акуляраў на нашых "дабрадзеяў".

71. Пра якую *"адсутнасць рынку"* пішуць прафесары на с.169? Аказваецца, ў планах развіцця Беларусі, якія быццам распрацоўваліся ў Маскве, не ўлічваліся нацыянальна-рэгіянальныя інтарэсы (с.169). Голая палітызацыя!

72. Чаму на с.171 услед за заходнімі ідэолагамі нашы прафесары *называюць Беларусь "посткамуністычнай"*? Беларусь ніколі не была камуністычнай, яна была савецкай і сацыялістычнай. Вельмі цікава ведаць, што канкрэтна адраджаюць прафесары ў галіне культуры (с.170–175)? Хто культуру разбураў у савецкі час? (калі яе сёння адраджаюць). А можа,

наадварот, тады культуру развівалі, а сёння яе стараюцца разбураць “адраджэнцы”?

73. Навошта на с.171 закон “Аб мовах у Беларускай ССР”? Пасля рэферэндума 1995 г. ён страціў сваё першапачатковае значэнне. Аб развіцці беларускай мовы трэба было б сказаць больш карэктна і больш коратка. Не трэба забіваць галовы вучняў тым, што ім ведаць ў 9 класе не абавязкова.

74. *Навошта залішняя палітызацыя і ідэалагізацыя?* На с.173 “савецкі аўтарытарызм” (што гэта такое?), “ідэалагізаваная накіраванасць у літаратуры і мастацтве” (а дзе яе няма?), “панаванне партыйнага ідэалагічнага кантролю” (а сёння – кантролю з боку фінансавых мяшкоў!) і г.д. І наогул, што гэта за фразы для дзевяцікласнікаў на с.173: “Шлях да новай літаратуры, якая павінна служыць мастацтву (памыляецеся, прафесары: не мастацтву, а народу, перапісалі аднекуль і не падумалі), а не партыям і дзяржаве…”, “Пад дзяржаўнай апекай да канца 80-х гадоў жылося нядрэнна, а галоўнае – бесклапотна” (маецца на ўвазе беларускім пісьменнікам, літаратарам). Дзе вы сёння бачыце “новую літаратуру” і што гэта такое? Наперадзе якіх гісторыкаў аказаліся беларускія пісьменнікі ў асвятленні гісторыі (с.173)? Хіба ж пісьменнікі пішуць гісторыю? Параўнанне вельмі некарэктнае і незразумелае для вучняў 9 класа.

75. На с.174–175 называюцца малавядомыя пісьменнікі і паэты, але з яскравай БНФаўскай пазіцыяй (“адраджэнцы” перасыпаюцца прозвішчамі вельмі паважаных беларускіх пісьменнікаў і паэтаў). Кумірам прафесараў з’яўляецца В. Быкаў, які быў абласканы партыйнай наменклатурай КПБ, атрымаў усе ўзнагароды вялікай Радзімы – СССР, а затым стаў абліваць брудам краіну і народ, якія паднялі яго незаслужана на такую вышыню. У дапаможніку – кароткая біяграфія В. Быкава і яго вялізны партрэт. А чаму няма партрэтаў С. Грахоўскага, І. Шамякіна, І. Чыгрынава і іншых любімых беларускім народам пісьменнікаў?

76. На с.176–178 пытанні і заданні, многія з якіх супярэчлівыя і незразумелыя, на якіх не адкажуць і якія не выканаюць не толькі вучні 9



Библиотека БГУИР

класа, але і акадэмікі разам з прафесарамі (ім школьныя настаўнікі змаглі б паставіць вельмі нізкі бал). Наўрад ці патрэбна акцэнтаваць увагу вучняў 9 класа па розных пунктах гледжання і падыходах, пытацца іх асабістага пункту гледжання, якога ў іх няма, бо будзе яшчэ 11 клас, потым ВНУ і ўсё жыццё, на працягу якога трэба будзе вучыцца (гл. с.179).

77. Не трэба ўводзіць у зман вучняў на с.180, быццам пасля Вялікай Айчыннай вайны існавалі варыянты развіцця СССР, звязаныя з перабудовай дзяржаўнага і грамадскага ладу (на капіталістычны манер – пішыце чэсна, прафесары). Цёмныя сілы імперыялізму савецкі народ разам з КПСС знішчыў не дзеля таго, каб рэстаўрыраваць у СССР капіталізм, а каб развіваць, узмацняць сацыялістычны лад. Гэта – аксіёма. Хто ўсталяваў у вёсцы прыватную ўласнасць у гады вайны? Фашысты і здраднікі! Чаму прафесары хочуць, каб гэта не было праігнаравана пасля вайны? (с.180). Вы стаіце на класавай буржуазнай аснове і труслiва ўхваляеце капіталізм, баючыся, каб не зарабіць па шапцы ад беларускага народа. Адным словам, раней вы стаялі на класавых марксісцкіх пазіцыях, а сёння гэтак жа лёгка сталі на класавыя буржуазныя пазіцыі. А дзе ж навука марксісцкіх, савецкіх прафесараў?

78. Хацелася б ведаць, як адказалі б самі прафесары на пастаўленае вучням пытанне (с.181): “Як адбіліся на стане здароўя беларускага насельніцтва вынікі хімізацыі, меліярацыі, Чарнобыля”. Адказ могуць даць толькі спецыялісты-медыкі, а не вучні 9 класа. Наогул, заключная гутарка (с.180–181) ідзе на ўзроўні “размовы на камунальнай кухні”.

79. Думаю, што метадычныя парады на с.181–182 больш падыйшлі б да аспірантаў, ці студэнтаў-гісторыкаў, але не для вучняў 9 класа. Сінхранічная табліца на с.183–186 больш падыйшла б для вучняў 11 класа, а не 9 класа. Храналагічная табліца складзена ўдала і яна патрэбна ў падручніку.

80. Спіс літаратуры ўключае ў сябе ўсіх “айцоў беларускай дэмакратыі” (Ігнаценка, Казлоў, Калубовіч, Луцкевіч, Туронак і інш.). Літаратура падабрана тэндэнцыйна з мэтай дыскрэдытацыі савецкай гісторыі



Библиотека БГУИР

(Адамушка. Палітычныя рэпрэсіі 20–50-х гадоў на Беларусі; Врублевский, Протько. Из истории репрессий против белорусского крестьянства; Курапаты (зборнік); Куропаты: следствие продолжается; Туронак – Беларусь пад нямецкай акупацыяй і г.д.). Думаю, што ў вучняў 9 класа няма часу і няма патрэбы чытаць гэты “тлум”. Ім патрэбна глыбокае і праўдзівае асвятленне гісторыі на старонках вучэбнага дапаможніка.

Библиотека БГУИР

**Вучэбны дапаможнік для вучняў 11 класа**

У вучэбным дапаможніку “Гісторыя Беларусі для вучняў 11 класа утрымліваюцца тыя ж самыя памылкі, толькі ў крыху меншым памеры, што і ў вучэбным дапаможніку для 9 класа, і шматлікія суб’ектывісцкія палітыка-ідэалагічныя ацэнкі гістарычных фактаў. Уся гісторыя XIX і XX стст. аўтарамі аб’ядноўваецца тэрмінам “*мадэрнізацыя”*, *“пад якой разумеецца складаны і дастаткова працяглы, паступовы і нераўнамерны працэс трансфармацыі і рэканструкцыі грамадскай сістэмы”*. Аўтары лічаць, што ў XIX–XX стст. мадэрнізацыя была звязана з пераходам ад феадальнага да буржуазнага грамадства і азначала пераход ад традыцыйнага да сучаснага грамадства як у агульнасусветным, так і ў рэгіянальным маштабе (с.4).

*Па-першае*, калі ўважліва прааналізаваць вызначэнне тэрміна “мадэрнізацыя”, то нельга не заўважыць, што мадэрнізацыя – гэта тое ж самае, што і трансфармацыя, і рэканструкцыя. Такая невыразная і навукова неабгрунтаваная тэрміналогія абцяжарвае засваенне вучнямі ведаў, а розныя надуманыя канцэпцыі гісторыкаў адводзяць вучняў ад ведання сапраўднай гісторыі, бо канцэпцыяй падмяняецца сама гісторыя.

*Па-другое*, хаця аўтары і пішуць, што тэрмін “мадэрнізацыя” шырока выкарыстоўваецца ў сучаснай гістарычнай навуцы, але свядома не пішуць, у якой менавіта гістарычнай навуцы. У беларускай гістарыяграфіі няма ніводнай навуковай працы, у якой гісторыя XIX–XX стст. вызначалася б тэрмінам “мадэрнізацыя”. Гэты тэрмін аўтарамі запазычаны і механічна перанесены з заходняй буржуазнай гістарыяграфіі з той мэтай, каб тэрміналогія савецкай гістарыяграфіі (індустрыялізацыя, калектывізацыя сельскай гаспадаркі, культурная рэвалюцыя і інш.) дзеля ўгоды Захаду выйшла з ужытку, а пануючай стала тэрміналогія заходняй гістарыяграфіі. Палітыка-ідэалагічны падтэкст такой навацыі праглядаецца вельмі яскрава.

*Па-трэцяе*, аўтары лічаць, што ў XIX–XX стст. мадэрнізацыя была звязана з пераходам ад феадальнага да буржуазнага грамадства, але чамусьці свядома не пішуць, хаця дакладна ведаюць, што ў гэты гістарычны перыяд

Библиотека БГУИР

адбываўся пераход не толькі ад феадальнага грамадства да буржуазнага, але і ад буржуазнага да сацыялістычнага. Такі ўчынак аўтараў трэба разумець так, што сённяшнія вучні – будаўнікі суверэннай Беларусі – не павінны нічога ведаць пра гісторыю савецкага перыяду, быццам яе не было наогул, а былі нейкія "мадэрнізацыі", "трансфармацыі", "рэканструкцыі" і г.д. Тым больш, што на с.8 аўтары сцвярджаюць, што ў 1917 г. – сярэдзіне 80-х гг. мадэрнізацыя "па ідэалагічных меркаваннях не дасягнула ў поўным аб'ёме сваіх канчатковых мэт: стварэння рыначнай эканомікі, грамадзянскай супольнасці, прававой дзяржавы". І ні слова пра савецкую ўладу, будаўніцтва сацыялізма… Аўтары дакладна ведаюць, што ў гэты перыяд у СССР і БССР і не ставілася такіх задач, як стварэнне рыначнай эканомікі, грамадзянскай супольнасці, прававой дзяржавы, бо гэта каштоўнасці буржуазнага грамадства, не сумяшчальныя з сацыялізмам.

Цяпер некалькі слоў пра памылкі фактычнага характару. Іх шмат, але назавём толькі некаторыя. На с.12 напісана: "Назву "Айчынная" вайна 1812 г. атрымала ў рускай публіцыстыцы ў 1813 г. з мэтаю адрознення і супрацьпастаўлення баявых дзеянняў на тэрыторыі Расіі, у тым ліку і Беларусі, ад замежных паходаў рускай арміі ў 1813–1814 гг.". На самой справе назву "Айчынная" гэтая вайна атрымала не з мэтай "адрознення і супрацьпастаўлення", а з мэтай падкрэсліць, што гэта была вайна народаў Расійскай імперыі за свабоду і незалежнасць Айчыны. І не трэба блытаць гісторыю, асабліва ў школьным падручніку.

Гаворачы пра развіццё сельскай гаспадаркі ў першай палове XIX ст., аўтары на с.18 пішуць аб тым, што паступова "скарачаліся пасевы малаўраджайных культур (лён, каноплі, жыта і інш.)", а на с.19 напісана аб тым, што "з развіццём рыначных адносін было звязана пашырэнне пасеваў тэхнічных культур: лёну і канаплі". На самой жа справе, пашыраліся ці скарачаліся пасевы? Як тут разабрацца вучням?

На с.80 напісана аб тым, што "К. Каліноўскім упершыню была выказана ідэя аднаўлення беларускай дзяржаўнасці". Чаму аднаўленне беларускай

дзяржаўнасці, калі яе да гэтага наогул не было? Чаму беларускай дзяржаўнасці, калі праз некалькі радкоў аўтары пішуць аб тым, што “К. Каліноўскі, выступаючы за прызнанне дзяржаўнай самастойнасці Літвы – Беларусі…” фактычна ратаваў за аднаўленне дзяржаўнасці ў форме Вялікага княства Літоўскага, якое ні ў якім разе не ўяўляла сабой толькі дзяржаўнасць беларускую? На гэтай жа старонцы напісана пра беларускую нацыянальную ідэю, а на с.83 пытаюць вучняў: “Ці патрэбна народу нацыянальная ідэя?”. Тут жа прапануюць тэму рэферата: “Афармленне беларускай нацыянальнай ідэі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.”. А што такое “беларуская нацыянальная ідэя”, аўтары вучэбнага дапаможніка адказу на гэтае пытанне не даюць.

На с.86 памылкова напісана аб тым, што “у лістападзе 1917 г. з дэлегатаў ад беларускіх губерняў – членаў Устаноўчага сходу быў створаны Б*еларускі абласны камітэт (БАК)*, які выступаў за аўтаномію Беларусі ў складзе Расійскай Федэрацыі”. Сапраўды БАК быў створаны з дэлегатаў ад беларускіх губерняў, але не Устаноўчага сходу, а I Усерасійскага з’езда сялянскіх дэпутатаў у лістападзе 1917 г. у Петраградзе. Ізноў памылкова напісана на с.87 аб тым, што Аблвыканкамзах прыняў рашэнне аб роспуску Усебеларускага з’езда, фактычна гэта зрабіў Саўнарком Заходняй вобласці і фронта.

На с.91 напісана аб тым, што “у лістападзе 1918 г. было абвешчана аб адраджэнні Польскай дзяржавы”, а ў наступным абзацы сцвярджаецца, што “у ліпені 1918 г. палякі пачалі шырокае наступленне на Украіну і Беларусь”. Як жа палякі маглі пачаць наступленне ў ліпені 1918 г., калі іх дзяржава – Польшча – была створана толькі ў лістападзе 1918 г.?

На с.96 напісана: “Пасля першага ўзбуйнення БССР, калі ў склад рэспублікі ўвайшла значная частка насельніцтва Віцебскай і Магілёўскай губерняў, паўстала пытанне аб узмацненні нацыянальнай палітыкі”. На самой справе, калі ў 1924 г. адбывалася першае ўзбуйненне БССР, Магілёўскай

Библиотека БГУИР

губерні ўжо не існавала. Яна была ліквідавана ў 1919 г., і на яе базе была створана Гомельская губерня.

На с.101–102 памылкова сцвярджаецца аб тым, што “к канцу 30-х гг. была ў асноўным ліквідавана непісьменнасць насельніцтва рэспублікі. Колькасць пісьменных ва ўзросце 9–49 гг. узрасла з амаль 60% у 1926 г. да 88% у 1939 г. Фактычна к канцу 30-х гг. была ліквідавана *масавая непісьменнасць дарослага насельніцтва*, а колькасць пісьменных у БССР па перапісу 1939 г. складала 78,9%. Далей напісана: “Вялікую ролю адыгралі ўвядзенне абавязковага пачатковага навучання (1925 г.), а потым і сямігадовага (1932 г.)”. Фактычна рашэнне аб увядзенні ўсеагульнага абавязковага пачатковага навучання было прынята ў 1926 г., а ўведзены пачатковы ўсенавуч толькі ў 1932 г. Усеагульнае абавязковае сямігадовае навучанне пачало ўводзіцца ў БССР у 1930/1931 вучэбным годзе, а цалкам удалося яго ажыццявіць толькі ў пасляваенныя гады – у канцы 50-х – пачатку 60-х гг. Памылкова сцвярджаецца аб тым, што быццам бы школа Савецкай Беларусі ігнаравала лепшы вопыт дарэвалюцыйнай школы – увага да якасці падрыхтоўкі, прафесійная арыентацыя і інш.

У гарадах і паветах Заходняй Беларусі пасля вызвалення яе Чырвонай Арміяй ствараліся не *часовыя ўпраўленні* (с.112), а часовыя ўправы. Дагавор у Маскве 23 жніўня 1939 г. быў падпісаны паміж СССР і Германіяй, а не Германіяй і СССР, як напісана на с.111 вучэбнага дапаможніка, “пакт Молатава – Рыбентропа”, а не “Рыбентропа – Молатава”, як напісана ў дапаможніку. На с.113 утрымліваецца наўмысная інсінуацыя аб тым, што напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны “хоць у дзейнасці абаронных таварыстваў і пераважаў разлік на знешні эфект, яна так ці інакш рыхтавала працоўных да будучых выпрабаванняў”. Вывучаныя намі архіўныя і іншыя дакументы сведчаць аб тым, што абаронныя таварыствы, якія дзейнічалі напярэдадні вайны, “не так ці інакш рыхтавалі працоўных да будучых выпрабаванняў”, а рабілі гэту работу добра і прафесійна, рыхтавалі сапраўдных абаронцаў Айчыны.



Библиотека БГУИР

На с.113 галаслоўна, бяздоказна сцвярджаецца аб тым, што “Беларусь не была падрыхтавана да абароны”. Рыхтавалася да абароны не Беларусь, а Савецкі Саюз, часткай якога з’яўлялася Беларуская ССР. Аўтары памылкова лічаць на с.119, што перамогі Чырвонай Арміі пад Сталінградам і Курскам азначалі карэнны пералом у ходзе Вялікай Айчыннай вайны. На самой справе, перамогі пад Сталінградам і Курскам з’явіліся важнымі вехамі на шляху забеспячэння карэннага пералому ў ходзе Вялікай Айчынанй і Другой сусветнай вайны. Карэнны пералом у ходзе вайны звязваецца не толькі з перамогай пад Сталінградам і Курскам, але і з паспяховым наступленнем Чырвонай Арміі летам і восенню 1943 г., вызваленнем Левабярэжнай Украіны і сталіцы Савецкай Украіны г. Кіева. Завяршэнне карэннага пералома супадае з канцом 1943 г. Новы завяршальны этап Вялікай Айчыннай вайны пачынаецца з 1944 г. Незразумела, што абазначае фраза дапаможніка на с.122: “У БССР загінуў кожны чацвёрты – трэці яе жыхар”. Колькі ж людзей загінула на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны – больш 2,2 млн. чалавек ці больш 3 млн. чалавек? Так пісаць для вучняў нельга.

Можна прыводзіць яшчэ вялікае мноства фактаграфічных памылак, але патрэбы ў гэтым няма.

Увесь вучэбны дапаможнік – ад першай старонкі і да апошняй – уяўляе сабой выданне пэўнай палітыка-ідэалагічнай арыентацыі. Ізноў “дасталася” індустрыялізацыі, калектывізацыі, метаду сацыялістычнага рэалізма, пабудове “дзяржаўнага сацыялізму”, партыйна-дзяржаўнай наменклатуры, панаванню дзяржавы над асобай і г.д. (с.97–102). Сцвярджаецца аб тым, што на рубяжы 20–30-х гг. была пачата палітыка абмежавання беларускай мовы, якая знайшла сваё адлюстраванне ў рэформе беларускага правапісу, праведзенай у 1933 г. (с.103), расказваецца пра “галадамор” 1933 г. як вынік калектывізацыі (с.105), пра культуру, якая была пастаўлена пад кантроль дзяржавы, што абмяжоўвала свабоду творчасці ў яе розных галінах (с.106),

Библиотека БГУИР

пра дэмакратычныя дзяржавы (Англію і Францыю), дзе меліся сілы, якія імкнуліся падштурхнуць Гітлера да агрэсіі на Усход (с.111) і г.д.

Каб пацвердзіць немагчымасць далейшага існавання СССР, аўтары наўмысна прыводзяць даныя па рэферэндуму аб набыцці незалежнасці Украінай 1 снежня 1991 г., дзе 70% выбаршчыкаў прагаласавалі за поўную незалежнасць сваёй краіны (с.153). Але не прыводзяцца даныя аб выніках галасавання на рэферэндуме ў сакавіку 1991 г. у БССР, іншых рэспубліках і ў цэлым па СССР, дзе народы выказаліся за захаванне адзінай вялікай і магутнай дзяржавы. Сцвярджаецца на с.155 аб тым, што "усе спробы пабудаваць сацыялістычнае грамадства не далі чакаемых вынікаў". Няпраўда, у СССР і БССР было пабудавана грамадства, альтэрнатыўнае капіталізму. А гэта і ёсць не што іншае, як грамадства сацыялістычнае.

А чаго каштуюць галаслоўныя і бяздоказныя сцвярджэнні палітыка-ідэалагічнага характару на с.170: "… У 60–80-я гг. у культуры паявілася тэндэнцыя да дэнацыяналізацыі, якая падштурхоўвалася курсам партыі на хутчэйшае збліжэнне і зліццё нацый і народнасцей, іх культур і моў", "сацыялістычная альбо камуністычная ідэалогія стане духоўнай асновай для ўсіх нацыянальных культур", "вынікам ідэалагізацыі культурных працэсаў… стала замацаванне метаду сацыялістычнага рэалізму", "агульначалавечыя каштоўнасці павінны быць вышэй за партыйна-класавыя", "падзел дзеячаў культуры на прыхільнікаў аўтарытарнага палітычнага рэжыму і тых, хто склаў яму апазіцыю", "нацыянальнае адраджэнне і духоўнае разняволенне" і г.д.

Нельга не прывесці вытрымкі з пытанняў і заданняў на с.170–171 вучэбнага дапаможніка: "Паспрабуйце вызначыць, які тып эканамічнай мадэлі найбольш аптымальны ў нашай рэспубліцы: а) адзяржаўлены, з панаваннем уласнасці на сродкі вытворчасці; б) змешаны, у якім прыватна-прадпрымальніцкі сектар у гаспадарцы спалучаецца з дзяржаўным рэгуляваннем эканомікі; в) прыватны з пераважаннем недзяржаўных форм вядзення гаспадаркі і асабістай уласнасці на сродкі вытворчасці". Няўжо



Библиотека БГУИР

аўтары думаюць, што ў дапаможніку можна знайсці адказы на гэтыя пытанні? Што гэтае заданне пасільна для вучняў сярэдняй школы? А можа, гэта заданне для дактароў і кандыдатаў эканамічных навук? Было б лепш, каб у вучэбным дапаможніку аўтары растлумачылі вучням сутнасць беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця, яе састаўныя кампаненты і запыталі аб гэтым у тых, каму прызначаны дапаможнік.

І яшчэ адно заданне, як і многія іншыя, на с.170–171: "Паспрабуйце растлумачыць, чаму ў асяроддзі інтэлігенцыі, якая мела высокі культурна-адукацыйны ўзровень, рос апазіцыйны настрой у адносінах да грамадскага жыцця ва ўмовах існавання аднапартыйнай палітычнай сістэмы. Дзеля праўды скажам, што апазіцыйных настрояў у інтэлігенцыі ў цэлым не было, у тым ліку, наколькі нам вядома, не было такога настрою і ў аўтараў данага вучэбнага дапаможніка. Незразумела, чаму сёння яны хочуць прадставіцца апазіцыянерамі і ў ролі апазіцыі прадставіць усю інтэлігенцыю. Сапраўды, сярод некаторай часткі інтэлігенцыі апазіцыйныя настроі былі: гэта так званыя дысідэнты – людзі, якія атрымлівалі матэрыяльна-фінансавую дапамогу з боку фірм, асацыяцый і арганізацый ЗША і Заходняй Еўропы, а таксама тыя прадстаўнікі, якія ў савецкі час вучыліся на Захадзе (чубайсы, яўлінскія, гайдары і ім падобныя).

* * *

Нельга не звярнуць увагу на некаторыя раздзелы эксперыментальнага падручніка "Сусветная гісторыя навейшага часу 1918–1945 гг." (Мінск, 2002) для вучняў 9 класа, напісаныя прафесарам У.Н. Сідарцовым. На с.152 чытаем: "З вясны 1943 г. у цэнтры рознагалоссяў аказалася пытанне пра трагедыю ў Катыні. У Катынскім лесе на Смаленшчыне былі выяўлены масавыя пахаванні расстраляных польскіх афіцэраў. Расследаванне, якое пачалі яшчэ немцы ў час акупацыі Смаленшчыны, паказвала, што расстрэлы праводзіліся да нападзення Германіяй на СССР. Пасля вызвалення гэтай тэрыторыі польскі ўрад патрабаваў ад Урада СССР правядзення новага расследавання з удзелам польскіх спецыялістаў. Савецкі ўрад з абурэннем адвергнуў гэта

патрабаванне і разарваў адносіны з урадам Польшч. Аднак пазней, ва ўмовах "галоснасці" у СССР (з сярэдзіны 80-х гг.) на аснове савецкіх дакументаў было ўстаноўлена, што гэта злачынства было здзейснена органамі НКУС па рашэнні Палітбюро ЦК УКП(б). Расстраляныя (а іх было каля 15 тыс.) – гэта польскія афіцэры, якія былі захоплены Чырвонай Арміяй у верасні 1939 г. у час яе паходу ў Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну і знаходзіліся ў савецкіх лагерах да вясны 1940 г.".

Калі тое злачынства, пра якое піша У.Н. Сідарцоў, было ўстаноўлена ім "на аснове савецкіх дакументаў", тады трэба назваць і надрукаваць гэтыя дакументы. Такія дакументы пакуль што не выяўлены. Калі ёсць "рашэнне Палітбюро ЦК УКП(б)", тады яго таксама патрэбна надрукаваць і зрабіць даступным для вучоных і шырокай грамадскасці. Пакуль што заявы аб злачынным рашэнні Палітбюро з'яўляюцца галаслоўнымі і недаказанымі. Колькасць расстраляных польскіх афіцэраў – 15 тыс. чалавек (ёсць у некаторых выданнях і 20 тыс. чалавек) таксама з'яўляецца недаказанай, хоць у апошні час гэтыя вялізныя лічбы вандруюць з аднаго вучэбнага выдання ў другое. Сёння задача даследчыкаў заключаецца ў тым, каб устанавіць гістарычную праўду наконт таго, хто ў сапраўднасці здзейсніў цяжкае злачынства супраць чалавечнасці ў Катынскім лесе каля Смаленска ў пачатку 40-х гг. XX ст., як і тое, хто здзяйсняў у 1920–1921 гг. генацыд у адносінах 83 тыс. пленных чырвонаармейцаў з польскага боку, з тым, каб такое больш ніколі не паўтарылася. У падручніках і вучэбных дапаможніках павінна ўтрымлівацца гістарычная праўда, тое, што ўстаноўлена ў гістарычнай навуцы, а не меркаванні іх аўтараў.

На с.145 утрымліваецца такое заданне для вучняў: "Выявіце, наколькі аб'ектыўны генерал А.А. Уласаў, які свядома супрацоўнічаў з нямецкім камандаваннем, у сваім пісьме "Чаму я стаў на шлях барацьбы з бальшавізмам?". Дайце маральную ацэнку яго паводзінам. "…Я выступаю на барацьбу супраць бальшавізму… Я ўбачыў, што нічога з гэтага, за што змагаўся рускі народ… у выніку перамогі бальшавікоў ён не атрымаў.



Бібліятэка БГУІР

Я бачыў, як цяжка жылося рускаму рабочаму, як селянін быў загнаны насільна ў калгас, як мільёны рускіх людзей знікалі, арыштаваныя без суда і следства". Няўжо прафесар У.Н. Сідарцоў не разумее, што калі А.А. Уласаў свядома супрацоўнічаў з фашыстамі, дык аб яго аб'ектыўнасці няма чаго і пытаць у вучняў, як і даваць маральную ацэнку яго паводзінам. *Гэта – першае.* Усім вядома, што гэтыя пісьмы-адозвы да рускага народа пісаліся не самім генералам А.А. Уласавым, а нямецкімі спецслужбамі, а таксама ідэалагічным ведамствам Гебельса. Няўжо можна гэтыя фальшыўкі даваць для аналізу нашым вучням. *Гэта – другое.* І, нарэшце, падобныя тэксты заўсёды выкарыстоўваліся падрыўнымі ідэалагічнымі цэнтрамі Захаду для дыскрэдытацыі дзяржаўнага і грамадскага ладу СССР, яго кіраўніцтва. З гэтых тэкстаў спісваюць характарыстыку савецкага дзяржаўнага і грамаскага ладу сённяшнія фальсіфікатары айчыннай гісторыі, тыя, каму вельмі не падабаецца сацыялізм і камунізм. Няўжо такія тэксты мы можам "падкідваць" нашым вучням для іх разумовай дзейнасці?

**Вывад. Прааналізаваныя намі вучэбныя дапаможнікі для вучняў сярэдняй школы ўтрымліваюць грубыя памылкі фактаграфічнага характару, а таксама суб'ектывісцкія палітыка-ідэалагічныя ацэнкі гістарычных фактаў. У практыцы работы школ яны ўжывацца не могуць. Вучэбныя дапаможнікі патрабуюць сур'ёзнай канцэптуальнай навуковай перапрацоўкі.**

Библиотека БГУИР